МАЙСТЭРНЯ НАСТАЎНІКА

Т. Ю. Аброськіна С. І. Байкова

Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)

3 клас

Комплексныя работы

Дапаможнік для настаўнікаў
установ адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы
агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

Мінск
«Сэр-Віт»
2027

Ад аўтараў

Паважаныя настаўнікі!

Дапаможнік змяшчае комплексныя работы, у якія ўваходзяць тэксты і заданні для праверкі і ацэньвання ўзроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў вучняў 3-га класа па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)».

Комплексная работа – гэта пісьмовая форма кантролю, якая выяўляе ўменне вучняў арыентавацца ў тэксце, разумець поўны і дэталёвы змест твора, вызначае ўзровень умення шукаць і знаходзіць інфармацыю ў тэксце, выкарыстоўваць інфармацыю, якая змяшчаецца ў творы, у розных сітуацыях.

Матэрыялы дапаможніка адпавядаюць узроўню адукацыйнай падрыхтоўкі вучняў 3-га класа і суадносяцца з раздзеламі навучальнай праграмы па літаратурным чытанні. У дадзеным выданні прадстаўлены тэксты твораў, якія ўваходзяць у кола чытання трэцякласнікаў, некаторыя тэксты рэкамендаваны вучэбнай праграмай для пазакласнага чытання.

Дадзенае выданне не толькі дапаможа настаўнікам пры арганізацыі пісьмовага кантролю, але

і будзе спрыяць удасканальванню чытацкіх уменняў вучняў, якія фарміруюцца толькі ў працэсе аналізу літаратурнага твора. Дапаможа забяспечыць неабходны ўзровень самастойнасці вучняў 3-га класа.

Для правядзення комплекснай работы настаўніку неабходна падрыхтаваць індывідуальныя бланкі з тэкстамі і заданнямі да іх у двух варыянтах. На выкананне работы адводзіцца 20–25 хвілін.

Пры ацэньванні работы ўлічваюцца толькі чытацкія ўменні вучняў. Дапушчаныя ў свабодным пісьмовым выказванні арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя і моўныя памылкі выпраўляюцца настаўнікам, але не ўплываюць на ацэнку заданняў.

Кожнае асобнае заданне работы з тэкстам ацэньваецца баламі (ад 1 да 3). За правільнае выкананне задання з выбарам аднаго адказу выстаўляецца 1 бал, з выбарам некалькіх адказаў – 2 балы. За правільнае выкананне задання са сціслым адказам – 2 балы, з разгорнутым адказам – 3 балы.

Заданне лічыцца выкананым правільна, калі выбраны поўны набор правільных варыянтаў адказаў ці дадзены поўны правільны адказ (сціслы ці разгорнуты). За правільна выкананае заданне налічваецца максімальны бал.

Разгорнутыя рэкамендацыі па арганізацыі правядзення і ацэнцы комплексных работ можна знайсці ў «Метадычных указаннях па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненню норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах» (https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html).

Жадаем поспехаў вам і вашым вучням!

ПРЫГОЖАЯ ПТУШКА ПЕР'ЕМ, А ЧАЛАВЕК – ВУЧЭННЕМ

Варыянт 1

Цяжкая задача

Ядвіга Бяганская

Ганя зноў не рашыла задачку.

– У маім задачніку гэтай задачкі няма, – сказала яна настаўніцы.

– Як гэта няма?! – здзівілася Вольга Паўлаўна. – Хіба ў цябе не такі задачнік, як у іншых вучняў?

– Няма... – паўтарыла Ганя, пацiскаючы плячыма.

– Хто яшчэ не знайшоў у сваім задачніку гэтай задачкі? – спытала настаўніца, абводзячы позіркам прыціхлы клас.

Вучні маўчалі.

– Выходзіць, што толькі ў Ганіным задачніку яе няма, – сказала Вольга Паўлаўна. – Дай мне свой задачнік, Ганя. Можа, у ім старонкі пераблытаны?

– А задачнік я дома пакінула, – прамовіла Ганя. – Навошта мне такі задачнік? Я новы куплю.

– Вазьмі свой задачнік, – падала ёй настаўніца кніжку.

Ганя залілася чырванню і вінавата паглядзела на Вольгу Паўлаўну.

Заданні да тэксту

1. Як звалі галоўную гераіню твора? Абазнач знакам ✓. (1 бал.)

☐ Таня ☐ Маня ☐ Ганя

2. Як дзяўчынка растлумачыла настаўніцы, што не рашыла дамашнюю задачку? Абазнач знакам ✓. (1 бал.)

☐ задачка складаная
☐ у задачніку гэтай задачкі няма
☐ задачка цяжкая

3. Якое правіла наконт падручнікаў нагадала настаўніца вучням класа? Абазнач знакам ✓. (1 бал.)

☐ падручнік трэба абгарнуць вокладкай
☐ кнігі трэба браць чыстымі рукамі
☐ задачнік трэба заўсёды прыносіць у клас

4. Чаму дзяўчынка не дала задачнік, калі настаўніца папрасіла яе? Падкрэслі сказы ў тэксце. (2 балы.)

5. Выпішы з тэксту сказ, які даказвае, што дзяўчынка не была адказнай вучаніцай. (2 балы.)

_____


_____

6. Як паступіла настаўніца, калі дзяўчынка сказала, што не рашыла задачу? Запішы. (2 балы.)

_____

_____

7. Разгледзь ілюстрацыі. Якія з іх падыходзяць да твора? Абазнач знакам ✓. (2 балы.)



☐



☐



☐

8. Пранумаруй лічбамі ад 1 да 4 падзеі ў тым парадку, у якім яны адбыліся ў творы. (3 балы.)

☐ Вольга Паўлаўна заўважыла на падлозе кніжку.

☐ Ганя зноў не рашыла задачку.

ЗМЕСТ

Ад аўтараў 3

Прыгожая птушка пер'ем, а чалавек – вучэннем

Варыянт 1

Цяжкая задача 6

Варыянт 2

Аб чым спрачаліся кнігі 11

Увосень і верабей багаты

Варыянт 1

Мядзведзь 16

Варыянт 2

Падранены журавель 21

Чалавек без Радзімы, што салавей без песні

Варыянт 1

Адкуль пайшлі беларусы 26

Варыянт 2

Добры Жыцень 31

Добры чалавек і жывёлу шкадуе

Варыянт 1

Шпачыныя песні 36

Варыянт 2

Журка 41

Зімовы дзянёк, што камароў насок

Варыянт 1

Люты 46

Варыянт 2

Верабейчык 51

Як ты да людзей, так і людзі да цябе

Варыянт 1

Аленчыны канькі 56

Варыянт 2

Яблычак 61

Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае

Варыянт 1

Самыя дарагія падарункі 65

Варыянт 2

Малінавы чай 71

Вясенні дзень год корміць

Варыянт 1

Голас вясны 77

Варыянт 2

Песня вясны 83

Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць

Варыянт 1

Работка 89

Варыянт 2

Каб мама ўсміхалася 95

Мірна жыць – шчаслівым быць

Варыянт 1

Буслы 100

Варыянт 2

На вайне і такое бывала.

Адважны 105

Спіс выкарыстаных крыніц 110